

Школьнікі пабылі на адкрытым пасяджэнні суда

Важнае Грамадства

07.04.2023 administrator 1808

Урокі бываюць самыя розныя, а гэты для навучэнцаў 8-11 класаў школ раёна, у тым ліку тых, з якімі інспекцыя па справах непаўналетніх праводзіць індывідуальную прафілактычную работу, меў асаблівы, нязвыклы для Дзятлаўшчыны фармат адкрытага судовага пасяджэння.

Прайшло яно ў раённым цэнтры культуры і народнай творчасці, глядзельная зала якога на час вынясення прысуду ператварылася ў судовую. Аднак, як любы ўрок, мерапрыемства несла ў сабе адукацыйныя мэты – папярэдзіць супрацьпраўныя паводзіны ў сферы незаконнага абароту і ўжывання наркотыкаў, навучыць непаўналетніх не рабіць татальных памылак, якія могуць зламаць жыццё, у тым ліку не толькі вінаватаму, але і яго блізкім.







На гэты раз на лаве падсудных былі двое дарослых мужчын, якія самі гадуюць дзяцей-падлеткаў. Судовае пасяджэнне вёў суддзя Дзятлаўскага раёна Сяргей Сёмуха, у якасці дзяржаўнага абвінаваўцы на ім прысутнічала памочнік пракурора Дзятлаўскага раёна Ірына Забеліна.



Абодва падсудныя – жыхары гарадскога пасёлка Казлоўшчына, прычым адзін – ураджэнец нашага раёна, другі – Расійскай Федэрацыі з відам на жыхарства ў Беларусі. Учыненае імі злачынства звязана з вырабам, захоўваннем, перавозкай наркотыкаў. Мужчыны былі затрыманы ў студзені гэтага года, у іх знойдзены наркаўтрымліваючае рэчыва, якое абвінавачаныя хавалі ў машыне, шпрыцы з ін’екцыямі, а па месцы жыхарства ў час вобыску – блэндар і газавая плітка са слядамі наркатычнага сродку. На момант затрымання падсудныя былі ў стане наркатычнага ап’янення, якое пацверджана медыцынскім асведчаннем. Сваю віну прызналі поўнасцю, раскаяліся, актыўна супрацоўнічалі са следствам.



Дзеянні ўраджэнца нашага раёна кваліфікаваны як незаконны пасеў і вырошчванне наркаўтрымліваючых раслін для вырабу наркотыку, а таксама незаконны без мэты збыту выраб, перапрацоўка, захоўванне і перавозка наркатычнага сродку – ён асуджаны да трох гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Дзеянні ўраджэнца Расійскай Федэрацыі кваліфікаваны як незаконнае без мэты збыту набыццё, захоўванне і перавозка наркатычных сродкаў – ён атрымаў пакаранне ў выглядзе двух гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.



Маёмасць, якая стала сродкам учынення злачынства, а гэта 2 аўтамабілі, канфіскавана, як і рэчыўныя доказы. У долевым парадку ў даход дзяржавы з асуджаных спагнаны працэсуальныя выдаткі ў суме 339 рублёў 27 капеек.

Рашэнне суда пракаменціравала Ірына Забеліна:

– Судом Дзятлаўскага раёна пастаноўлены абвінаваўчы прысуд на двух жыхароў раёна за ўчыненне злачынства, прадугледжанага часткай 1 артыкула 328, а на ўраджэнца Дзятлаўшчыны яшчэ і часткай 1 артыкула 329 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Санкцыі абодвух артыкулаў прадугледжваюць таксама іншыя віды пакарання без пазбаўлення волі, аднак падставаў для іх не знайшлося. Пазіцыя пракурора і дзяржабвінаваўцы была аднолькавай, суд з ёй таксама згадзіўся.

Прысуд абвешчаны, але ў законную сілу яшчэ не ўступіў, і абодва абвінавачаныя маюць права на апеляцыйныя скаргі.

Ірына СТЫРНІК

Подписывайтесь на телеграм-канал «Дятлово ОНЛАЙН» по короткой ссылке @gazeta_peramoga

ПОДПИШИТЕСЬ НА НАС
В INSTAGRAM

ЧИТАЙТЕ ТАКЖЕ:

У госці да Сонейка

08.07.2021

В Гродненской области наблюдается рост хищений с банковских карт

04.09.2020

Минздрав: у большинства пациентов с COVID-19 болезнь протекает легко или бессимптомно

26.03.2020

МЫ В СОЦИАЛЬНЫХ СЕТЯХ

ЛЕНТА НОВОСТЕЙ



К интернет-челленджу «Песня недели» присоединился народный хор ветеранов труда «Ветераны в строю»

15.04.2024 Комментарии отключены




Приглашаем поучаствовать в интернет-челлендже «Песня недели»

15.04.2024 Комментарии отключены



Дзелавы панядзелак. На нарадзе: “За бяспеку” і на суботнік – разам

15.04.2024 Комментарии отключены



Реклама. Теперь и в соцсетях

15.04.2024 Комментарии отключены



Ведае ўчастковы. Дзе не месца для веласіпеда?

15.04.2024 Комментарии отключены



В Беларуси аграриям предстоит засеять весной более 2,3 млн га

15.04.2024 Комментарии отключены



Синоптики прогнозируют похолодание и мокрый снег на этой неделе

15.04.2024 Комментарии отключены



Наступаючы на пяты лепшым алімпіяднікам

15.04.2024 Комментарии отключены

ПОСЛЕДНЕЕ | ПОПУЛЯРНОЕ | ОБСУЖДАЕМОЕ



К интернет-челленджу «Песня недели» присоединился народный хор ветеранов труда «Ветераны в строю»

15.04.2024 Комментарии отключены



Приглашаем поучаствовать в интернет-челлендже «Песня недели»

15.04.2024 Комментарии отключены



Дзелавы панядзелак. На нарадзе: “За бяспеку” і на суботнік – разам

15.04.2024 Комментарии отключены



Реклама. Теперь и в соцсетях

15.04.2024 Комментарии отключены



Ведае ўчастковы. Дзе не месца для веласіпеда?

15.04.2024 Комментарии отключены



В Беларуси аграриям предстоит засеять весной более 2,3 млн га

15.04.2024 Комментарии отключены



Синоптики прогнозируют похолодание и мокрый снег на этой неделе

15.04.2024 Комментарии отключены



Наступаючы на пяты лепшым алімпіяднікам

15.04.2024 Комментарии отключены

ГАЗЕТА

Перамога
ДЯТЛОВСКАЯ РАЙОННАЯ ГАЗЕТА
DIATLOVONEWS.BY

Все права принадлежат редакции газеты «Перамога». При использовании публикаций сайта, ссылка на источник и автора обязательна. Перепечатка материалов только с письменного разрешения редакции. Активная и индексируемая гиперссылка на источник материала обязательна.

СТАТИСТИКА САЙТА



ГЛАВНЫЙ РЕДАКТОР

Комарова Ирина Чеславовна
+375-1563-3-29-60

E-MAIL

drgp21@mail.ru, drgp@diatlovonews.by

ПРИЕМ РЕКЛАМЫ

Лещун Марина Антоновна
+375-1563-3-29-62

© 2018 Дятлово | «Перамога» | Все права защищены